Н. А. Юрчанка
А. Ф. Журба

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

2



**Н. А. Юрчанка**
**А. Ф. Журба**

# ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

Вучэбны дапаможнік
для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2018

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 331(075.2=161.3)
ББК 3я71
Ю83

Рэцэнзент: метадычнае аб’яднанне настаўнікаў выяўленчага мастацтва дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 150 г. Мінска» (настаўнік выяўленчага мастацтва і працоўнага навучання вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *Н. А. Дзягель*)

Пераклад з рускай *А. У. Бельскай*

## Раздзелы:

Агульная тэхналогія

Тэхналогія гаспадарання

Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў

Тэхналогія раслінаводства

Тэхналогія народных рамёстваў

Выніковыя заняткі

Выкарыстоўваем інтэрнэт-рэсурсы (http://e-vedy.adu.by)

ISBN 978-985-7191-68-0

© Юрчанка Н. А., Журба А. Ф., 2018
© Бельская А. У., пераклад на беларускую мову, 2018
© Афармленне. РУП «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2018

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗМЕСТ


АГУЛЬНАЯ ТЭХНАЛОГІЯ
Матэрыялы . . . . . . . . . . . . . . . 4
Інструменты і прыстасаванні . . . . . . . . . . . 5
Працоўнае месца . . . . . . . . . 6
Этапы тэхналогіі . . . . . . . . . 7

ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ
Папера і кардон . . . . . . . . . . . 8
Аплікацыя з паперы . . . . . . . . 9
Вопыты з паперай і кардонам . . . . . . . . . . . . . . . 10
Паштоўка да свята . . . . . . . . . 12
Дзівосныя палоскі . . . . . . . . 14
Папяровая мазаіка . . . . . . . . 16
Канструяванне з паперы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Модульнае арыгамі . . . . . . . . 20
Арыгамі «Кардонка» . . . . . . 22
Тканіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Сурвэтка . . . . . . . . . . . . . . . . 26
Пляценне з нітак . . . . . . . . . . 30
Ператварэнне кутасіка . . . 32
Канструяванне з прыродных матэрыялаў . . . . . . . . . . . . . 34
Героі казкі «Калабок» . . . 36
Ператварэнне кардонкі . . . 38
Ператварэнне ёмістасці . . . 40

ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ
Выцінанка . . . . . . . . . . . . . . . 42
Віды выцінанкі . . . . . . . . . . 44
Фларыстыка . . . . . . . . . . . . . . 48
Пейзаж з лісця . . . . . . . . . . . . 50
Ператварэнне лісця . . . . . . . . 52
Залацістая саломка . . . . . . 54
Саламяны снапок . . . . . . . . . 56
Саламянае сонейка . . . . . . 57
Аплікацыя з саломінак . . . . 58

ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ
Сочым за сваім знешнім выглядам . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Упрыгожваем ёлку . . . . . . . . 62
Афармляем падарункі . . . . . 64

ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА
Расліны ў нашым доме . . . .66

ВЫНІКОВЫЯ ЗАНЯТКІ
Майстэрня падарункаў . . . . . 68
Летнія нарыхтоўкі . . . . . . . . . . 71




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# МАТЭРЫЯЛЫ

Назаві матэрыялы. Ты будзеш майстраваць з іх вырабы.








Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ІНСТРУМЕНТЫ І ПРЫСТАСАВАННІ

Гэтыя інструменты і прыстасаванні
дапамогуць табе ў працы.






Ніткаўцягвальнік



Напарстак



Крэйда

Для чаго патрэбны гэтыя інструменты і прыстасаванні?









Якія матэрыялы і інструменты спатрэбяцца,
каб змайстраваць такія вырабы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА

Захоўвай парадак на працоўным месцы.
Перад сабой рассцялі падкладную цырату. Справа пакладзі інструменты, якія бяруць правай рукой.
Злева — інструменты, якія бяруць левай рукой.
Матэрыялы пакладзі перад сабой. Падручнік пастаў на падстаўку.




Працоўнае месца для ляўшы    Працоўнае месца для праўшы

**Захоўвай правілы паводзін і бяспечнай працы.**
Уважліва слухай і выконвай указанні настаўніка.
Захоўвай у чысціні і парадку працоўнае месца.
У час працы будзь уважлівы і не перашкаджай аднакласнікам.
Правільна арганізуй працоўнае месца.
Трымай інструмент так, як паказаў настаўнік.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Зможам зрабіць на ўроках






## ЭТАПЫ ТЭХНАЛОГІІ

**1. Падрыхтоўчы.** Арганізуй працоўнае месца.
**2. Асноўны.** Змайструй выраб.
**3. Заключны.** Ацані сваю працу сам і папытай думку іншых.

1

2

3




Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПАПЕРА І КАРДОН



Падручнікі зроблены з паперы і кардону. Іх ствараюць людзі розных прафесій. Аўтар піша тэкст. Мастак малюе ілюстрацыі. Вярстальшчык размяшчае тэкст і малюнкі на старонцы. Рэдактар робіць у тэксце неабходныя змяненні. Друкар на станку друкуе аркушы кнігі. Пераплётчык злучае аркушы і дадае вокладку.







Для працы з паперай і кардонам патрэбны інструменты.






Правілы бяспечнай працы нажніцамі паглядзі на форзацы.

Выконвай правілы працы з клеем.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# АПЛІКАЦЫЯ З ПАПЕРЫ

**Парадак выканання аплікацыі.**
Спачатку размець дэталі аплікацыі. Іх можна размеціць па трафарэце (1) або шаблоне (2). Можна намаляваць ад рукі (3).

1



2



3



Затым выражы дэталі (4). Раскладзі іх на аснове (5). Наклей іх на аснову (6).




4



5



6



Зрабі аплікацыю.









Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ДОСЛЕДЫ З ПАПЕРАЙ І КАРДОНАМ

Параўнай уласцівасці.

**Папера** **Кардон**

Што лягчэй ірвецца? Чаму?





Што больш шчыльнае? Чаму?





Што цяжэй сагнуць? Чаму?





Што хутчэй намакае? Чаму?







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Праца з кардонам

З кардону можна выразаць розныя фігуркі.





Вазьмі шаблон і пакладзі на адваротны бок ліста кардону. Шчыльна прыціскай шаблон, каб ён не ссунуўся. Размець фігурку па шаблоне (1—3).








Выражы фігурку нажніцамі. Пры вырэзванні паварочвай ліст кардону, а не нажніцы. Упрыгож фігурку аплікацыяй. Такой фігуркай можна аздобіць падарунак.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПАШТОЎКА ДА СВЯТА

Такую паштоўку ты можаш зрабіць сам.



## Падрыхтоўка асновы для паштоўкі

Вазьмі ліст тонкага кардону. Размець лінію згібу з дапамогай трохвугольніка і алоўка (1). Працісні лінію згібу (2).

1



2



Сагні кардон (3). Прапрасуй згіб (4). Атрымалася аснова для паштоўкі (5).

3



4



5





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Упрыгажэнне паштоўкі

Зрабі кветку.




Зрабі лісток.




Зрабі матылька.




Наклей буйныя дэталі на паштоўку. Дадай дробныя дэталі.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ДЗІВОСНЫЯ ПАЛОСКІ

З прамых палосак можна скласці розныя фігуркі.



**Падрыхтуй палоскі.**

1 2



5



Размець аркуш паперы.

3 4



Разрэж. Атрымаліся палоскі.

**Складзі трохвугольнік.**

1 2 3 4



Склей канцы палоскі.

5 6






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Складзі шасцівугольнік




Калі палоска кароткая, прыклей
да яе другую.

**Ствары з сябрамі зорнае неба.**
Папяровыя фігуркі наклей на аснову.






Якія яшчэ фігуры можна скласці з палосак паперы?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПАПЯРОВАЯ МАЗАІКА









Якія колеры перадаюць радасць або сум, холад або цяпло? Чым адрозніваюцца прапанаваныя мазаікі? Як зрабіць дэталі для будучай мазаікі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Папяровая мазаіка «Грыбок»

Выканай эскіз для мазаікі (1). Адрэж некалькі палосак. Нарэж палоскі на кавалачкі (2). Намаж клей на невялікую частку асновы (3).

1



2



3




4



Наклей кавалачкі паперы на аснову (4). Прамакні анучкай (5). Атрымалася мазаіка (6).

6



5



Раскажы, якія колеры ты выбраў. Чаму?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# КАНСТРУЯВАННЕ З ПАПЕРЫ

З паперы можна стварыць цэлую краіну: дамы, дрэвы, машыны. Зрабі сельскую сядзібу.



Зрабі дрэва.







Падумай, як зрабіць елку, яблыню.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Зрабі хатку (дамок).**

Склей трубачкі з паперы — гэта будуць бярвенцы для хаткі.

1



2



Збяры хатку.

3




4



5




6



7



8



9





Падрыхтуй дах, акенцы і наклей на хатку.

**Зрабі агароджу.**

1



2



3







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# МОДУЛЬНАЕ АРЫГАМІ

Арыгамі — гэта складванне фігурак з паперы.





Такія розныя фігуркі збіраюць з аднолькавых дэталяў — модуляў.

Складзі трохвугольны модуль.




Атрымаўся модуль.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Разгледзь модуль. У яго ёсць два ражкі і дзве кішэні.




Зрабі з аднакласнікамі шмат рознакаляровых модуляў. Збяры вазачку. Злучы модулі. Ражок аднаго модуля ўкладвай у кішэню другога.

1



2



3



4



5



6







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# АРЫГАМІ «КАРДОНКА»

Складзі базавую форму «квадрат».




Атрымалася базавая форма для складвання кардонкі.




Паўтары дзеянні 8, 9.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

10



11



12



13



Паўтары дзеянні 11, 12, 13.

14



15





Атрымалася кардонка.

Атрыманую кардонку ўпрыгож аплікацыяй.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ТКАНІНЫ

Тканіны бываюць розныя. Іх можна зрабіць з валокнаў раслін. З бавоўны (1) робяць баваўняныя тканіны. З ільну (2) — льняныя тканіны.
З тканіны шыюць розныя рэчы.

1





2







3



4



5



6

Параўнай паперу і тканіну.

| **Папера** | **Тканіна** |
|---|---|
| Што рвецца лягчэй? Чаму? | |
|  |  |
| Што мякчэйшае? Чаму? | |
|  |  |
| Што камячыцца менш? Чаму? | |
|  |  |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Інструменты для працы з тканінай




**Раскраі сурвэтку.**
Раскладзі тканіну на стале. Пакладзі лякала на тканіну. Размець тканіну па лякале крэйдай або алоўкам. Выкраі сурвэтку па лініі разметкі. Не падымай тканіну са стала.






**Зрабі махры па баках сурвэткі.**





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# СУРВЭТКА

Вырабы з тканіны ствараюць людзі розных прафесій. Швачка сшывае дэталі з тканіны. Для працы ёй патрэбная і простая іголка, і швейная машына.





**Выконвай правілы бяспекі.**



Трымай іголкі ў ігольніцы.
Не ўколвай іголкі ў адзенне.
Не бяры іголкі ў рот.
Шый толькі з напарсткам.
Не пакідай на вучэбным месцы іголку без ніткі.
Да працы і пасля яе правярай колькасць іголак.





Для шыцця і вышывання выкарыстоўваюць розныя ніткі.

Выберы для вышывання ніткі такога колеру, каб вышыўка была бачная. На якім малюнку правільна падабраны ніткі?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Адмерай даўжыню ніткі.

Уцягні нітку ў іголку.
Табе дапаможа ніткаўцяг-
вальнік.








Завяжы вузельчык на канцы ніткі.




## Шво «ўперад іголку»




Прашый шво «ўперад іголку».
Замацуй нітку на тканіне.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Рознакаляровыя ўзоры

На тканіне вышываюць розныя ўзоры. Вышыўка можа рабіцца ўздоўж чатырох бакоў (1). Узорам можна ўпрыгожыць цэнтр сурвэткі (2). Узор можна вышыць у ражку (3).

1



2



3



Узорам уздоўж двух бакоў упрыгожваюць ручнікі.



##Ператварэнне шва «ўперад іголку»

1



2



3



Можна ператварыць шво «ўперад іголку» ў хвалю (1), ланцужок (2), шнурочак (3).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выберы нітку для ўзору на сурвэтцы.
Адмерай даўжыню ніткі і ўцягні нітку ў іголку.
Замацуй нітку на тканіне каля шва «ўперад іголку».




Ператвары шво ў **хвалю**, як паказана на малюнку.
Тканіну не праколвай.




Хвалюператвары ў **ланцужок**.




Шво «ўперад іголку»ператвары ў **шнурочак**.




Чым шнурочак адрозніваецца ад хвалі?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЛЯЦЕННЕ З НІТАК

Такія вырабы майстрыхі плятуць са звычайных нітак.





Для працы можна ўзяць ніткі рознага колеру.
Сплясці коску з трох пасмаў.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Завяжы вузельчыкам ніз коскі.
Ты ўжо ўмееш рабіць кутасік з нітак.
Упрыгож коску кутасікам.





**Варыянты выкарыстання коскі**





Прыдумай свае варыянты выкарыстання коскі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЕРАТВАРЭННЕ КУТАСІКА

Успомні і раскажы, як робіцца кутасік.




## Ператварэнне кутасіка ў ляльку

Зрабі кутасік (1). Аддзялі пасмы для стварэння рук (2). Перавяжы іх (3). Падрэж на патрэбную даўжыню (4). Атрымалася лялька (5).






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Фігуркі лялек

Зрабі ляльку-дзяўчынку.



Зрабі ляльку-хлопчыка.



Аформі лялькі.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# КАНСТРУЯВАННЕ З ПРЫРОДНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ



Галінкі дрэў



Суквецце лопуху



Пяро



Кара



Жалуды



Лясны арэх



Грэцкі арэх



Каштан



Сасновыя шышкі



Хвоя (ігліца)



Яловыя шышкі

Што можна зрабіць з арэхаў? каштана? суквеццяў лопуху?




**Работнікі лесу**

Ляснік саджае і ахоўвае лес. Ад яго працы залежыць здароўе лесу.

Егер на працягу года дапамагае звярам і птушкам.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Дрэва




## Птушка




## Караблік

З якіх прыродных матэрыялаў можна зрабіць караблік? З чаго можна вырабіць парус (ветразь)? Зрабі караблік.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ГЕРОІ КАЗКІ «КАЛАБОК»

Жылі-былі дзед і баба. Зрабі фігурку дзеда.






Скачала баба калабок, спякла яго.

Падумай, падбяры матэрыялы і зрабі фігурку бабы. Зрабі калабка.

Сустрэў калабок зайца.

Зрабі фігурку зайца.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Сустрэў калабок ваўка. Зрабі фігурку ваўка.




Сустрэў калабок мядзведзя.

Падбяры матэрыялы і зрабі фігурку мядзведзя.



Сустрэў калабок лісу.

Зрабі лісу.



Прыдумай свой працяг гісторыі калабка.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЕРАТВАРЭННЕ КАРДОНКІ



Кардонкі бываюць рознага памеру і формы. З іх можна зрабіць цацкі.



З дзвюх кардонак можна зрабіць забаўнага звярка. Адна кардонка — галава, другая — тулава. Дэталі вачэй, вушэй, носа, рота, лапак, хваста можна прыклеіць.



Пачкі з-пад запалак лёгка ператварыць у машынку ці паравозік. Коламі могуць стаць кружочкі з кардону.

Можна зрабіць мэблю для лялькі.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Пеўнік — залаты грабеньчык

Падбяры кардонкі.

1 

2 

3 

4 

5 

6 

На аркушы паперы абвядзі алоўкам адзін бок кардонкі (1). Павярні кардонку на іншы бок (2). Прадоўжы размячаць, як паказана на малюнках (3—6).

7 

8 


9 

10 

Атрымалася разгортка. Выражы яе (7). Абклей кардонку (8).
Падрыхтуй яшчэ адну кардонку, але меншага памеру. Склей дзве кардонкі (9).
Намалюй на паперы дэталі вачэй, дзюбы, крылаў, грабеньчыка, хваста (10). Выражы і наклей іх на кардонкі (11—12).

11 


12 



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЕРАТВАРЭННЕ ЁМІСТАСЦІ

Пластмасавыя ёмістасці бываюць рознай формы і памеру.



З іх зроблены гэтыя прыгожыя вазачкі.



## Смешны чалавечак

Вазьмі пластмасавую ёмістасць. Уверсе прыклей палоску пластыру. Ля асновы прыклей другую палоску пластыру.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

На пластыр наклей шпагат. Карыстайся клеем ПВА. Абкруці ёмістасць шпагатам. Шпагат неабходна накручваць вельмі шчыльна.

1




2



3



Прыклей канец шпагату да пластыру.
Зрабі з вяроўкі рукі і ногі. Наклей іх на ёмістасць.

4



5



6



7




8





9



Намалюй і выражы з паперы дэталі вачэй, рота, носа.
Наклей іх на ёмістасць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ВЫЦІНАНКА

Выцінанка — гэта ўзор, выразаны з паперы. У даўніну выцінанкамі ўпрыгожвалі вокны, дзверы, сцены.



У наш час выразаюць сняжынкі да Новага года. Імі ўпрыгожваюць вокны, паштоўкі, падарункі. Аформленымі ў рамкі выцінанкамі аздабляюць інтэр'ер.






Раскажы, як робіцца выцінанка.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Сняжынка




Складзі паперу. Які ражок трэба зрэзаць, каб у цэнтры сняжынкі атрымаўся выраз?

Што атрымаецца ў цэнтры, калі зрабіць розныя зрэзы? Зрабі і правер.






Як трэба зрэзаць ражкі загатоўкі, каб атрымаліся выразы па краях сняжынкі? Зрабі і правер.




Якая форма сняжынкі табе падабаецца больш? Выражы свой узор.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ВІДЫ ВЫЦІНАНКІ



1  

Узор рытмічны, паўтараецца шмат разоў. Такая выцінанка называецца **рапортнай**. Папера складваецца гармонікам (1).

  

2

3



На малюнку ёсць сіметрыя. Такая выцінанка называецца **сіметрычнай**. Папера складваецца папалам (2).

Узор сіметрычны і паўтараецца па крузе. Такая выцінанка называецца **разеткавай**. Папера складваецца на ражок (3).

Як складваў майстар паперу для выразання выцінанак?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Выразанне сіметрычнай і разеткавай выцінанак

Складзі паперу папалам. Намалюй узор. Выражы (1).

1



Складзі паперу ражком. Намалюй узор. Выражы (2).

2



Разгледзь выцінанкі (3, 4). Як патрэбна скласці паперу? Складзі. Якую частку ўзору трэба намаляваць? Намалюй. Выражы выцінанку.

3



4





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Выразанне рапортнай выцінанкі

Разгледзь паслядоўнасць выразання рапортнай выцінанкі.






Мастак намаляваў узоры. Разгледзь іх. Ці можна па іх выразаць рапортныя выцінанкі? Чаму?





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Складзі паперу гармонікам. Намалюй узор. Выражы.



Разгледзь рапортныя выцінанкі. Складзі паперу.
Якую частку ўзору патрэбна намаляваць? Намалюй.
Выражы выцінанку.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ФЛАРЫСТЫКА

Фларыстыка — гэта стварэнне кампазіцый з высушаных раслін.
Прыдумвае такія кампазіцыі мастак-фларыст.









## Доследы з лістком

Параўнай уласцівасці зялёнага і сухога лісткоў.

Які лісток гнецца? Чаму?





Які лісток лепш рэжацца? Чаму?







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Віншавальная паштоўка

Кампазіцыю на паштоўцы можна стварыць з лісця і кветак.





Падрыхтуй аснову. Падбяры расліны. Зрабі кампазіцыю на падрыхтаванай аснове.

1



2



3



4



Намаж клей на расліну ў трох месцах. Наклей на аснову вялікія расліны. Затым наклей маленькія расліны.

5




6







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЕЙЗАЖ З ЛІСЦЯ

Мастакі-фларысты ствараюць пейзажы з засушанага лісця і кветак.





Разгледзь пейзажы. Лісток падобны на крону дрэва. Вялікія лісткі абазначаюць дрэвы, якія стаяць бліжэй да нас. На аснове яны знаходзяцца ніжэй. Дрэвы ўдалечыні — маленькія лісткі. Яны размешчаны вышэй.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Прыдумай пейзажную кампазіцыю. Выберы аснову. Блакітная папера падобная на неба і ваду ў возеры, зялёная — на траву.

1



Падбяры расліны і ствары пейзаж на аснове. Лісткі можна накладваць адзін на адзін.



2 3 4 5



Адзнач алоўкам некалькі кропак вакол кожнай расліны. Спачатку наклей лісце, якое ўдалечыні. Потым тое, што бліжэй да нас.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПЕРАТВАРЭННЕ ЛІСЦЯ

Разгледзь і параўнай відарысы матылька і парсючка.



Якое лісце выкарыстаў мастак?
Чым можна дапоўніць відарысы стракозы і кураняці?



Якое лісце можна выкарыстаць?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

З восеньскай лістоты можна стварыць казачны куток прыроды. Разгледзь яго жыхароў. З якога лісця яны зроблены?



Ствары з аднакласнікамі куток прыроды. Пасялі ў ім казачных жывёлін.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЗАЛАЦІСТАЯ САЛОМКА

Трактарыст узараў поле і пасеяў насенне жыта.
Сонца абагрэла зямлю, дожджык яе паліў.
Вырасла жыта. Сцёблы жыта называюць саломай.




Такія цуды робяць майстры са звычайнай саломкі.










Правообладатель Адукацыя і выхаванне







Майстры выкарыстоўваюць саломку розных раслін.
Падрыхтуй саломку да працы. Разрэж на часткі. Абчысці.




**Доследы з саломкай**

Параўнай саломінку і пластыкавую трубачку.

Што гнецца? Чаму?





Што лепш рэжацца? Чаму?







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# САЛАМЯНЫ СНАПОК

Падрыхтуй вяровачку. Збяры пучок з саломінак. Дадай да пучка каласкі. Перавяжы.




Падраўнуй саломінкі знізу. Акуратна расхіні саломінкі зверху. Перавяжы снапок прыгожай стужкай.








Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# САЛАМЯНАЕ СОНЕЙКА

Зрабі сонейка.




Сонейка можна ўпрыгожыць аплікацыяй.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# АПЛІКАЦЫЯ З САЛОМІНАК

З саломінак можна зрабіць аплікацыю.



Выберы аснову — кардон цёмнага колеру. Прыдумай кампазіцыю аплікацыі.
Адрэж саломінкі патрэбнай даўжыні. Для аплікацыі можна выкарыстоўваць доўгія і кароткія кавалачкі.





Раскладзі саломінкі на аснове.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Саломінкі можна прыклеіць па-рознаму.

1




2








Здымай з асновы па адной саломінцы.
Змаж саломінку клеем. Прыклей на аснову.
Спачатку наклей доўгія саломінкі, потым кароткія.







Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# САЧЫ ЗА СВАІМ ЗНЕШНІМ ВЫГЛЯДАМ





Штораніцы мый рукі і твар, чысці зубы, прычэсвайся.





У школу хадзі акуратна прычасаны.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне


1


2


3

Сачы за сваім адзеннем і абуткам.
Вопратку захоўваюць на вешалцы (1). Адзенне чысцяць шчоткай (2). Адзенне мыюць і прасуюць.
Абутак змазваюць крэмам і начышчаюць да бляску (3).
Штодня абутак праціраюць ад пылу.

Даглядаць адзенне і абутак нам дапамагаюць людзі розных прафесій.
Работнікі пральні і хімчысткі мыюць і чысцяць адзенне.
Майстры па рамонце падаўжаюць тэрмін службы адзення і абутку.









Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# УПРЫГОЖВАЕМ ЁЛКУ

Ёлка — галоўны атрыбут навагодняга свята. Яе можна ўпрыгожыць цацкамі, зробленымі сваімі рукамі. З палосак паперы ствараюць гірлянды і падвескі.



Прыдумай і зрабі свае ўпрыгажэнні для ёлкі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Зрабі ліхтарык.




## Зрабі кветку і шышку.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# АФАРМЛЯЕМ ПАДАРУНКІ

Падумай, што можна падараваць сябрам, бацькам.
Які падарунак ты можаш зрабіць сам?



Падарунак неабходна прыгожа ўпакаваць. Для гэтага выкарыстоўваюць маляўнічую паперу з узорамі. Упакаваныя падарункі ўпрыгожваюць стужкамі, кветкамі.




Паўтары дзеянні 4—7 з другога боку.






Правообладатель Адукацыя і выхаванне



## Уручаем падарункі

Як правільна ўручаць падарунак? А як прымаць? Дапамажы героям ілюстрацый. Падкажы, хто з іх робіць няправільна, а хто — правільна. Раскажы чаму.















Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# РАСЛІНЫ Ў НАШЫМ ДОМЕ



Вырошчвае пакаёвыя расліны кветкавод. Ён іх палівае, апырсквае, перасаджвае. Мы купляем расліны для ўпрыгожвання сваіх дамоў.

Дзе ў пакоі можна размясціць расліны?



Расліны лепш ставіць групамі.









Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## Догляд раслін

Расліны неабходна рэгулярна даглядаць. Паліваць, праціраць лісткі, апырскваць, правільна расстаўляць.

Кожная расліна мае свае асаблівасці. Іх трэба ведаць. Тады кветка будзе прыгожай, здаровай.

**Фіялка**





**Прымула**





**Традэсканцыя**





Station Паназірай за пакаёвымі раслінамі на працягу дня. Як яны выглядаюць раніцай, днём, вечарам?



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# МАЙСТЭРНЯ ПАДАРУНКАЎ

Прайдзі па дарожцы-тэхналогіі. Якая кветка ў цябе атрымалася?






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Якіх правілаў неабходна прытрымлівацца ў час працы?






Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Такія вырабы мы змайстравалі



Ты ўжо шмат ведаеш, умееш, можаш.
Наперадзе цябе чакаюць новыя творчыя поспехі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ЛЕТНІЯ НАРЫХТОЎКІ

У сухое надвор'е збяры лугавыя травы, калоссе, дэкаратыўныя расліны.






Сушы расліны ў сухім цёмным месцы.





Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Юрчанка** Наталія Аляксандраўна
**Журба** Аляксандр Фёдаравіч

# Працоўнае навучанне

Вучэбны дапаможнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Для работы ў класе

| | |
|---|---|
| Рэдактар | *А. У. Бельская* |
| Мастацкі рэдактар | *К. Ю. Сарока* |
| Мастак вокладкі | *К. Ю. Сарока* |
| Мастак | *Н. Ф. Харытонава* |
| Камп'ютарны набор | *А. У. Бельская* |
| Камп'ютарная вёрстка | *К. Ю. Сарока* |
| Карэктар | *А. У. Бельская* |

Падпісана да друку 02.05.2018. Фармат 60х90 1/8.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9. Ул.-выд. арк. 7,7. Тыраж 8675 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/19 ад 14.11.2014.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# ПРАВІЛЫ БЯСПЕЧНАЙ ПРАЦЫ

**НЯПРАВІЛЬНА** | **ПРАВІЛЬНА**



















# ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА



# ЛІНІІ ЧАРЦЯЖУ

**Суцэльная тоўстая асноўная лінія**

**Штрыхпунктірная лінія з дзвюма кропкамі**











# УМОЎНЫЯ ЗНАКІ АРЫГАМІ



Згіб гарой



Згіб далінай



Сагні і разгладзь



Перавярні



Цягні, валачы



Паўтары дзеянне
з адваротнага боку



Увагні ўнутр




Раскрый

# ПРАВІЛЫ БЯСПЕЧНАЙ ПРАЦЫ

## НЯПРАВІЛЬНА










## ПРАВІЛЬНА










# ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА



# ЛІНІІ ЧАРЦЯЖУ

**Суцэльная тоўстая асноўная лінія**

**Штрыхпунктырная лінія з дзвюма кропкамі**











# УМОЎНЫЯ ЗНАКІ АРЫГАМІ



Згіб гарой



Згіб далінай



Сагні і разгладзь



Перавярні



Цягні, валачы



Паўтары дзеянне
з адваротнага боку



Увагні ўнутр




Раскрый